"Непростой" рабочий — паровозный машинист или механик электростанции получал 100—120 и более рублей в месяц. На службе он носил кожаную тужурку бельгийского пошива, после работы облачался в пиджачную пару, крахмальную манишку, штиблеты, котелок и шел в бильярдную, уверенно помахивая тросточкой. Жил он в собственном доме где-нибудь на Грушевке с геранью на окошке и граммофоном на комоде, содержал неработающую жену и 5—6 детей. Иногда он даже нанимал кухарку.

Кроме простых и непростых рабочих, в 100-тысячном Минске обитала довольно значительная прослойка среднего класса. К ней принадлежали, например, педагоги Минской мужской правительственной гимназии. Директор гимназии Сергей Платонович Григорьев, статский советник, жалованья имел 1800 рублей в год плюс еще 800 рублей надбавок и казенную квартиру с отоплением и освещением. Всего денежного содержания — 4400 рублей в год или 370 в месяц.

Владимир Антонович Климонтович — тип педагога-труженика, тянувшего воз учебных нагрузок. Он еще выполнял обязанности инспектора гимназии, по-нашему — завуча. Имел годового жалованья 3500 рублей или 290 в мѐсяц.

Николай Иванович Заседателев, учитель русского языка и словесности. Либерал, борец с начальством, любитель опрокинуть рюмочку. Годового жалованья имел 2800 рублей или 230 в месяц. В частных гимназиях учительское жалованье было в полтора-два раза выше.

Прогуляемся вдоль дореволюционных витрин.

Ржаной хлеб в минских булочных продавался по цене 2 копейки за фунт (около 500 граммов). Ведро кваса — 30 копеек, ведро пива — 1 рубль 24 копейки. Очень хорошие хромовые сапоги стоили 8 рублей, простые яловые — 3. Полушубок стоил 10 рублей. Автомобиль марки Ford-T —2500 рублей.

Месячный наем дешевой жилой комнаты — 5 рублей. Вызов кареты скорой помощи общины Красного креста — 3. Частное врачебное посещение стоило 1—3 рубля. Существовала бесплатная медицина для бедных. Плата за воду из водопровода: 100 ведер — 15 копеек. Кроме того, за каждую ванну 5 рублей, за ватерклозет — столько же, за фонтан (!) — 42 рубля. Цены мест в городском театре им.Янки Купалы: ложи — 3—9 рублей, партер — 1—3, галерея — 30—50 копеек. Годовая подписка на крупную ежедневную газету составляла 6 рублей.

Услуги проституток: солдатская — 30 копеек (сервис в кустах у Свислочи) или 50 (задняя комната трактира, сарай) копеек; мещанская — рубль (наемная квартира); купеческая — 3—5 рублей (номер в гостинице "Европа").

Сергей КРАПИВИН, Марина ЗАГОРСКАЯ.

("Имя".)

Стоп-кадр



Пассажирский МАЗ — автобус для Вас

На снимке: *новый 18-метровый городской автобус на 160 пассажиров выпущен на Минском автозаводе.*

Фото Геннадия СЕМЕНОВА, БелТА.

Знешні гандаль

Экспарт расце, але і імпарт не адстае

Вынікі знешнеэканамічнай дзейнасці рэспублікі за 9 месяцаў абмеркаваны на пашыраным пасяджэнні калегіі Мінзнешэканамсувязей. У яе рабоце прынялі ўдзел першы віцэ-прэм'ер Пётр Пракаповіч, прадстаўнікі зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

На калегіі адзначалася, што сёлета за тры кварталы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічыліся пастаўкі за мяжу калійных угнаенняў, хімічных валокнаў і ніцей, трактароў, грузавых аўтамабіляў, металарэзных станкоў, шын і іншай прадукцыі.

Гэта дало магчымасць значна перавыканаць устаноўленае заданне па нарошчванні аб'ёмаў экспарту. Пры плане 113,8 тэмпы яго склалі 121,8 працэнта. Але ў той жа час ужо сёння зразумела, што прагнозныя паказчыкі па абмежаванні імпарту не будуць выкананы. Таму ўдзельнікі пасяджэння асноўную ўвагу засяродзілі на далейшых шляхах актывізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці. У прыватнасці, было прапанавана шырэй выкарыстоўваць магчымасці кааперацыйных сувязей рэгіянальнага супрацоўніцтва дылерскай сеткі.

Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

Эканоміка

Прыватызацыі — да, "прыхватызыцыі" — не

Афіцыйная статыстыка сведчыць, што за 10 месяцаў 1997 года ў рэспубліцы рэфармавана 409 аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці, з іх 163 — рэспубліканскай і 246 — камунальнай. Прыярытэтнай формай пераўтварэнняў застаецца акцыяніраванне: створана 131 акцыянернае таварыства.

Завяршылася работа над праектам Дэкрэта "Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь", які ў бліжэйшы час будзе прадстаўлены на разгляд кіраўніка дзяржавы.

Прэзідэнт краіны А.Лукашэнка заняў рашучую пазіцыю. Ён лічыць, што раздзяржаўленне і прыватызацыя дзяржаўнай уласнасці павінны ісці без спешкі, улічваць інтарэсы дзяржавы. Гэтыя працэсы трэба праводзіць з улікам зацікаўленасці інвестараў, а таксама ўменне ў найкарацейшыя тэрміны наладзіць эфектыўную работу прадпрыемстваў. Прэзідэнт краіны асабліва упэўнены ў тым, што ва ўмовах пераходу на новыя формы гаспадарання дзяржава не можа больш мірыцца з існаваннем адстаючых прадпрыемстваў. Там, дзе кіраўнік не можа кіраваць па-сучаснаму, ён павінен быць заменены, павінны быць знойдзены больш эфектыўныя формы арганізацыі вытворчасці.

Сяргей БЫШКОЎ.

Уладзімір ПРАВАСУД

Назіральнікі

Усё прадумаў, не з наскоку,
За радком кладу радок.
З-за пляча прыцэльна вокам
Нехта сочыць: "Ах, браток..."
Сяду так, і сяду гэтак,
Зад падстаўлю незнарок —
Тое ж вока ды з імпэтам
Ліжа за радком радок.
Прыспяшае тэрмін вельмі —
Думкі свецяцца агнём.
Вока пільнае не дрэмле
Ані ноччу, ані днём.
Форму набыла задумка.
Вока ж тое, як дакор:
"Тут няправільная думка,
У цябе тут перабор".
Я стаю, нібы пытальнік,
Я хвалююся, прамок...
"Хто ты?" — "Я? Я — назіральнік!
Думай так, як я, браток!"
"Але ж гэта немагчыма!
У мяне свой погляд ёсць!"
"Ха, на свет глядзі вачыма
Ты маімі, ягамосць".
"Я не чуў такога зроду,
Я свабодны, я не лгу..."
"Дэмакратыю, свабоду
Трэ трымаць на ланцугу,
Бо жыццё — не аперэта,
Каб не зварухнуўся свет,
Будзе назіраць за гэтым
Назіральны наш савет".
Погляд восеньскі, пахмуры
Смех ледзь чутны з-пад вусоў.
Дык няўжо ізноў цэнзура
Страшных сталінскіх часоў?
Не абдураць на мякіне,
Ад натугі лопнуць хоць:
Не пасмеюць, не накінуць
На свабоду зноў аброць!
...Крыху задрамаў, здаецца,
І няёмка стала мне:
Ах, чаго не прывярзецца
Ці ў дрымоце, ці то ў сне!

Крымінал

Туды ім і дарога...

Ніхто не ведае, колькі фальшывых доларавых купюр ходзіць сёння на "чорным" рынку. Але з упэўненасцю можна сказаць, што 70 такіх падробак вартасцю 100 долараў кожная абмінуць даверлівых людзей. Супрацоўнікі транспартнай міліцыі затрымалі на мінскім чыгуначным вакзале грамадзяніна Расіі ў той момант, калі ён спрабаваў збыць адну 100-доларавую купюру сталічнаму таксісту. Пры асабістым аглядзе ў яго знайшлі яшчэ 69 такіх жа фальшывак. Як, адкуль і чые яны — гэтым цяпер займаюцца спецыялісты з Упраўлення ўнутраных спраў на транспарце МУС.

Таццяна СМІРНОВА.

Генерал заплаціць 5 мільярдаў і "пераселіцца" ў калонію

Да чатырох гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі агульнага рэжыму прыгавораны былы начальнік упраўлення заказаў і закупак тылу Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр запасу Якаў Ткачук. Такі прыгавор вынесла гэтымі днямі Ваенная калегія Вярхоўнага суда нашай краіны.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў прэс-службе гэтага судовага органа, Якаў Ткачук асуджаны за злоўжыванне службовым становішчам і надбайныя адносіны да службы, што прывяло да цяжкіх вынікаў. У свой час у выніку яго злачынных дзеянняў камерцыйным структурам была бязвыплатна выдадзена 401 тона бензіну АІ-93. У сувязі з гэтым Ваенная калегія Вярхоўнага суда таксама пастанавіла спагнаць з Ткачука амаль 5 мільярдаў рублёў.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ, БелТА.

Дрыбін стаў пасёлкам

У мэтах упарадкавання адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будовы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка пастанавіў аднесці вёску Дрыбін — адміністрацыйны цэнтр Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці — да катэгорыі пасёлкаў гарадскога тыпу.

Указ аб гэтым падпісаны 19 лістапада 1997 года.

БелТА.

У суседзяў

Балтыйскія дзяржавы пазбаўляюцца ад бар'ераў

У Рызе адбылася сустрэча кіраўнікоў урадаў трох балтыйскіх дзяржаў. Гедзмінас Вагнорус, Гунтарс Крастс і Март Сійман абмеркавалі шырокі спектр пытанняў, звязаных з эканамічным супрацоўніцтвам у рэгіёне.

Асаблівую ўвагу прэм'еры ўдзялілі ажыццяўленню плана дзеянняў Балтыйскага Савета міністраў, Дагавору аб свабодным перамяшчэнні рабочай сілы і свабодным гандлі, трохбаковаму дагавору аб агульнатранзітных працэдурах і аблягчэнні працэдур перасячэння граніцы.

Па выніках сустрэчы падпісаны Дагавор аб адмене нетарыфных гандлёвых бар'ераў.

Эльта-БелТА.

Вось сабраліся і вырашылі...

У Еўропу — толькі на "зялёным" аўтамабілі

У рэспубліцы сфарміравана сістэма абавязковай сертыфікацыі аўтамабіляў па нормах Еўрапейскай канферэнцыі міністраў транспарту "зялёны аўтамабіль" і "зялёны і бяспечны аўтамабіль". Гэта будзе садзейнічаць умацаванню пазіцыі беларускіх міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў на еўрапейскім рынку транспартных паслуг.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Беларускай асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў, такія сертыфікаты даюць права на бесперашкоднае перасячэнне граніц любой дзяржавы. Паводле афіцыйных даных, у рэспубліцы налічваецца каля 2,5 тысячы аўтамабіляў, якія патэнцыяльна павінны прайсці гэту працэдуру. Яна складаецца з некалькіх этапаў, у ходзе якіх правяраецца на спецыяльным абсталяванні стан асноўных сістэм транспартных сродкаў на прадмет уплыву на навакольнае асяроддзе.

Што ж канкрэтна стаіць за гэтымі паняццямі — "зялёны аўтамабіль" і "зялёны і бяспечны аўтамабіль"? "Зялёны" павінен адпавядаць строгім параметрам па экалогіі — выкідах шкодных рэчываў у атмасферу і шуму. "Зялёны і бяспечны" патрабуе яшчэ і адпаведнасці дарожным умовам. Ён павінен быць абсталяваны антыблакіровачнай тармазной сістэмай і абмежавальнікам па міжнародных патрабаваннях: да рулявога кіравання, фар, восі, колаў, падвескі, засцерагальнага ўстройства аўтамабіля.

Таццяна СМІРНОВА, БелТА.

Судебные уроки

И кровь, и слезы... и нелюбовь

"Cherchez l'amour" в переводе с французского — "ищите любовь". Слово "любовь" каждые пять минут звучит в сериалах из "забугорной" жизни, звучит с романтическим оттенком и чувственностью даже в кадрах про изнасилование. Доморощенные же секс-удавы руководствуются исключительно зовом дикой природы и добиваются своего угрозами, матом и мордобоем, что принципиально отличает их от извращенцев других национальностей. И это позор для белых руссов!

А все от того, что в суровой жизни наших сограждан слово "люблю" употребляется ограниченное число раз: обязательно перед загсом, чтобы доказать избраннице, мол, не лыком шит, остальное по пьянке — такова национальная традиция.

Интимные отношения воспринимаются многими не как наивысшее чувственное наслаждение, а как проза и механика. И это часто оборачивается преступлением и трагедией.

Тому пример — уголовное дело об изнасиловании Ольги М. (из этических соображений фамилии опускаю) в номере столичной гостиницы "Мотель", которое слушалось на закрытом заседании в апреле 1997 года в суде Минского района и города Заславля.

Владимир, высокий и симпатичный парень, после возвращения из армии работал мастером в одной из частных фирм, торопился с работы на вечеринку. Там, в квартире невесты его друга, собиралась компания молодежи. Лучший друг Максима и хозяйка квартиры рассчитывали, что кто-то из молодых людей приглянется отставному сержанту.

Гость с порога передал Елене торт и бутылку ликера, ненадолго отлучился в ванную комнату, чтобы смыть горячей водой с ладоней въевшуюся мазутную грязь...

Было далеко за полночь, когда Максим с Еленой и новоизбранная подруга отставного сержанта Ольга получили приглашение на завтра — выпить и отдохнуть в гостинице "Мотель". Владимир согласился оплатить полную программу уик-энда:

— С шиком посидим в ресторане. Снимем номер, а понравится — заночуем на все выходные...

Вчерашние школьницы были "на мели", перебивались случайными заработками и остались в восторге от этой идеи. Когда ребята прощались, Владимир уточнил у приятеля:

— С Ольгой не вляпаться бы в историю. Ей исполнилось восемнадцать?

— Взрослая. Стукнуло, кажется, в прошлом месяце...

Казалось, бы ясно, для чего будет сниматься номер в гостинице. Будущие свидетель преступления Елена и потерпевшая Ольга не мучились сомнениями — этично ли принимать подобные приглашения? Не лучше ли умыться холодной водой и опомниться. Пока не поздно...

В полдень следующего дня свежевыбритые кавалеры приехали за юными непорочными леди на "Ауди", которую Владимир выпросил на пару дней у дяди. Шикарное авто произвело ожидаемое впечатление на школьниц-выпускниц. Перед девицами — ах, как предупредительны кавалеры! — распахнулись все автодверцы, в салоне под лобовым стеклом лежала свежевскрытая пачка дорогих сигарет. "Соплячки" прикурили и небрежно развалились на заднем сиденьи. В бардачке их ждал еще один сюрприз — коробка шоколадных конфет. А впереди за стеклом бежала дорога к ресторану, шашлыкам и шампанскому. Казалось, молодые парни расшибутся в лепешку, лишь бы только выполнить их любую прихоть...

Сыр бывает бесплатным не только в мышеловке! А наивная мама утверждала обратное. "Все лучшее должно доставаться молодым и красивым, — приблизительно так думала Ольга, —Симпатичный парень, при деньгах..." Смущало, что знакомы они всего несколько часов.

В холле "Мотеля" Владимир потребовал номер, заплатил и небрежно подкинул ключи. Поднял сумку с выпивкой, с видом завсегдатая пошел к лестнице.

Позже компания веселилась в ресторане. Ребята старались казаться взрослыми и воспитанными. Вскоре оказалось, что они уже опорожнили последнюю бутылку водки. Максим что-то шептал на ухо невесте Елене. Владимир опустил потную ладонь на джинсовое колено своей приятельницы и предложил уйти по-английски, не прощаясь:

— Не будем мешать. Айда в комнату, еще выпьем и поговорим.

Пошатываясь, встал и подал девушке руку, помог отодвинуть тяжелое кресло. В зале царил полумрак. Он обнял девушку за плечи и, задыхаясь, шепнул в ухо горячими губами:

— Скажи честно, я тебе нравлюсь?

— Нормально...

Она ответила на поцелуй.

Входную дверь в номер кавалер сразу запер на ключ. Ольга сделала вид, что не заметила приготовлений. Он сел на кровать и притянул девушку к себе. Хищно блеснула во рту желтая фикса:

— Иди ко мне.

Она присела на край соседней кровати, высвобождая руку, и попыталась "заговорить" парня:

— Я ведь о тебе ничего не знаю, давай поговорим о тебе.

— Что рассказывать. Закончил техникум, загремел в армию. Теперь работаю мастером в кооперативе... — и зашептал: — Знаешь, какими голодными на баб приходят хлопцы на дембель! У меня будто лом в штанах. Хочу тебя...

Ухажер без лишних слов схватил Ольгу за бедро и попытался расстегнуть "молнию" на джинсах. Удалось порвать застежку. Владимир повалил девушку на постель.

Она вырвалась и отступила к балкону.

— У тебя есть сигареты? Давай выйдем на воздух, здесь душно.

Ольга казалась испуганной, ей было противно в первый раз отдавать свое тело мужчине-зверю. Именно таким сейчас был Владимир. Мелькнула мысль спрыгнуть с балкона второго этажа. Вот Володя немного успокоится и перестанет цепляться руками за края ее одежды, и тогда...

Но распаленный желанием поклонник с силой дернул свитер и толкнул ее на постель. Приказал раздеться. "Молния" окончательно разошлась, пуговица от джинсов отлетела. И Ольга с ужасом поняла, что вид белых трусиков действует на самца, как красная тряпка тореадора на быка. Разумный парень, которому она позволила напоить себя и увести в номер, совсем сошел с ума:

— Раздевайся, сука!

Ногами она стала молотить его по рукам.

— Задушу, падла.

Схватил ее за волосы и крутанул. Пока она корчилась от боли, сдернул брюки. Ольга брыкнулась, и тогда кулак въехал ей в нос, и лицо искательницы красивой жизни залила кровь.

— Пикнешь, накину на морду подушку и задушу. Вывезу в лес, и никто не найдет.

— Лена придет через полчаса, я ее предупредила.

— Если перестанешь брыкаться, успеем. Давай по-хорошему. Сама ведь меня "подначила" потратиться: хочу шашлыки, шампанское с шоколадом... Я рассчитался за заказ, теперь твоя очередь платить.

По выражению его лица она поняла, что это не шутка. Расчет. Это серьезно и вполне по-взрослому. Этой определенности она и добивалась, ссорясь с родителями по пустякам. Выходит, повзрослела в первую очередь сама. Надо платить по счетам. Сыр на халяву и прочая вкуснятина — только приманка?

И она закричала:

— Нет!

И Владимир, продолжая удерживать за волосы, сорвал трусики, задернул на шею свитер, опрокинулся на нее...

В дверь постучали. Владимир, прикрывая разбитые губы девушки дрожащей ладонью, крикнул, чтобы парочка еще погуляла. Оттуда донесся легкий смех, звук поцелуя, шепот "люблю". Стало тихо.

Кровь с лица запачкала простыни и смешалась с другой ее кровью, но насильник уже ничего не замечал...

Максим и Елена вернулись через двадцать минут. Закутанная в одеяло Ольга бросилась к двери:

— Ломайте дверь, выпустите меня отсюда. Что он со мной сделал, как больно...

И истерично заколотила кулаками по двери. Двое с той стороны навалились на ручку двери, защелка замка не выдержала, и спасатели ввалились в комнату.

Насильник предстал абсолютно голым, испачканным с ног до головы ее кровью и... улыбающимся. Смыв с себя кровь и одевшись, Владимир увлек в ресторан Максима. Елене было приказано успокоить Ольгу, привести в порядок ее одежду. Вскоре они все вместе сидели за столом в ресторане.

— Ведь ничего сверхъестественного не произошло... — объяснял свое поведение Владимир.

Морщась от боли, Ольга выпалила:

— Сволочь, ты мне все спереди и сзади разорвал. Я была девочкой. Заявлю в милицию. Думай что хочешь — посажу.

И ушла.

Суд приговорил насильника к изоляции от общества на три года в исправительно-трудовой колонии с усиленным режимом содержания.

"Cherchez l'amour". Ищите женщину по любви. Научитесь красивым словам и ищите. Повторяйте их снова и снова, пока не поверите в высокие чувства. Ведь женщина ближе, прекрасней, добрей и осязаемей, чем невидимый Бог, которому поклоняются миллионы. Она способна, как Бог, населить наш мир новыми поколениями людей. Но в ней есть и Дьявол. Попробуйте полюбить женщину по-настоящему. Иначе никогда не разрушить ад, который в нас самих. Мы называем его паршивой действительностью — жизнью, которую одним прочувствованным словом "люблю" легко превратить в противоположность, в рай.

И если вывод покажется наивным, обратитесь, например, к Максиму с Еленой, которые, кажется, счастливы...

Валерий ТАРАСОВ.

Монаспектакль

"Мне сняцца сны аб Беларусі"

Паэтычны монаспектакль з такой назвай днямі прадставіў Беларускі тэатр аднаго акцёра "Зьніч". У спектакль, аўтар і выканаўца якога — актрыса Галіна Дзягілёва, увайшлі малавядомыя і ненадрукаваныя пры жыцці паэта вершы, а таксама звесткі з біяграфіі, дакументы, лісты, доўгія гады прыхаваныя ад вока чытача.

Сёння на спектаклі тэатра "Зьніч" ёсць магчымасць убачыць нашага славутага паэта як фігуру сапраўды трагічную. У монаспектаклі Янка Купала паўстае не толькі знаёмым песняром кахання да радзімы, змагаром за росквіт, але паэтам, які прадчувае, асэнсоўвае сваё адзіноцтва, бяссілле разарваць той рабскі, векавечны сон, у якім апынулася ўся зямля беларуская.

І праслаўляюць мазалямі
Парабаціцеляў сваіх,
Сябе згубіўшы між людзямі,
Паміж мучыцеляў глухіх.
Няма нікому заступіцца,
Збудзіць заснуўшыя званы,
Прызваць к жыццю жывой расіцай
Нямыя сведкі-курганы.

Разрыў паміж натхнёнымі рэвалюцыйнымі марамі, верай Я.Купалы ў будучыню Беларусі і тым гвалтоўным, жахлівым "дзеяннем", якое адбывалася ў жыцці, у рэшце рэшт прывяло паэта да трагічнага канца.

Хлуслівы час вымушае ісці на нейкія кампрамісы, якіх не вытрымлівае сумленне паэта.

Увесь да дна выпівай чорны келіх жыцця,
Ці з вадой жыватворнай, ці з ядам;
З роўнай меркай чакай вечнаты й небыцця,
Заадно абдымайся з анёлам і гадам.
...бусел адзін стаіць хмуры, —
Яго аднаго ўсе неяк забылі,
Адзін ён не змесціўся ў шнуры.
Стаіць і чакае сабе прыгавору...

Спектакль адкрывае нам не адшліфаванага "песняра" савецкай эпохі, а паэта, які балюча адгукаецца на рэчаіснасць і сваё пакутніцкае двухсэнсоўнае становішча...

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Народная Воля
25 ЛІСТАПАДА 1997 г.

Дайджест

Теневой капитал Запада приблизился к... его бюджету

Газета "Джермани Лайв" публикует материал, посвященный проблемам борьбы с международной преступностью. Газета сообщает, что Интерпол намерен в ближайшее время сосредоточить основные усилия в борьбе с отмыванием денег и коррупцией. Газета также сообщает, что, по мнению чиновников из Интерпола, эти два вида преступлений уже настолько разрослись, что стали оказывать непосредственную угрозу для безопасности всех развитых стран. Газета отмечает, что, по данным "Интерпола", в настоящее время размер теневого капитала в странах Западной Европы и Америки уже вплотную приблизился к размерам бюджета этих стран. Газета также приводит слова генерального секретаря "Интерпола" Раймонда Кендала, который предлагает правительствам всех развитых стран в самые кратчайшие сроки принять в целях их же безопасности ряд конвенций и международных договоров, которые бы сделали невозможным легализацию незаконно нажитых средств и подкуп государственных чиновников.

Счетная палата считать умеет. Деньги налогоплательщиков

Газета "Райнише Пост" публикует материал, посвященный привилегиям чиновников и коррупции в Германии. Газета сообщает, что немецким политикам в ближайшее время, судя по всему, придется отказаться от бесплатных перелетов в заграничные командировки на самолетах военно-воздушных сил Германии. Газета также сообщает, что по настоящее время такая практика была широко распространена среди политических и общественных деятелей, которые посещали другие страны с официальными визитами. Газета отмечает, что решение о приостановлении подобной практики вызвано недавно опубликованным докладом счетной палаты Германии. Согласно этому докладу, пишет газета, политики и различного рода чиновники потратили за свои полеты более половины всех денег, которые были выделены в минувшем году ВВС Германии на учебные и тренировочные полеты. Самим же летчикам приходится теперь тренироваться на бесплатных тренажерах.

Новые пожертвования Джорджа Сороса на благотворительные цели. В России. А у нас?..

Финансист Джордж Сорос планирует потратить за следующие три года на благотворительные цели в России еще до полумиллиарда долларов, сообщает "Нью-Йорк Таймс". Как заявил сам Сорос в телефонном интервью газете, новые пожертвования будут направлены в сферы образования, здравоохранения и на обучение сокращаемых военнослужащих гражданским специальностям. Решение о новых пожертвованиях Сорос принял перед началом своего двухнедельного турне по России. По мнению Сороса, Борис Ельцин и его правительство заслуживают западной поддержки и помощи. Отметив, что положение правительства Черномырдина шаткое, Сорос уже не раз высказывал уверенность в том, что оно проработает еще по крайней мере три года. Как отмечает газета, начиная с 1987 года Джордж Сорос потратил в России на благотворительные цели 350 миллионов долларов. Новые же пожертвования сделают Россию крупнейшим в мире получателем пожертвований Сороса.

Спор длиною в пять столетий. Между турками и греками

Журнал "Тайм" стал виновником в новой вспышке 500-летнего спора между турками и греками о том, кто из них лучше, сообщает агентство "Франс Пресс". Дело в том, что "Тайм" начал в августе этого года опрос на тему, кто внес наибольший вклад в историю XX века. Вскоре после начала опроса тысячи турков с помощью Интернета, факса или обычной почты высказали свое мнение в поддержку Мустафы Кемаля Ататурка, основавшего Турецкую республику в 1923 году. Уже в начале сентября Ататурк возглавил опрос "Тайма", обойдя премьер-министра Великобритании Уинстона Черчилля, президента США Рональда Рейгана и нацистского диктатора Адольфа Гитлера. Неожиданно 4 октября Черчиль обогнал Ататурка, получив лишь в этот день более 40 тысяч голосов. Не составило большого труда обнаружить, что британский премьер получил поддержку греков и греческих киприотов. Однако лидерство Черчилля было недолгим, и сейчас список величайших политиков XX века вновь возглавляет, правда, с небольшим отрывом, Ататурк. Как отмечает "Франс Пресс", вокруг опроса "Тайма" наблюдается необычный социальный феномен: в то время как турки поддерживают представителя своей нации, греки лишь стараются не дать победить представителю Турции. Как бы то ни было, туркам рано справлять победу: опрос "Тайма" продлится до декабря 1999 года.

Туристический бизнес Германии ждет процветание. Деньги будут брать "за все"

Туристические компании Германии в скором времени начнут брать деньги с клиентов не только за консультации, но и просто за ознакомление с перечнем стран, в которые они предлагают путевки. По информации агентства ДПА, пойти на такие меры туристические компании будут скоро вынуждены из-за катастрофического положения, которое сложилось в туристическом бизнесе. Агентство отмечает, что в связи с нестабильной экономической ситуацией и огромным ростом безработицы в стране, граждане Германии предпочитают либо вообще не ходить в отпуск, либо проводить его дома. Количество же фирм, занимающихся туризмом, слишком велико, чтобы выжить в такой ситуации. Именно желание хоть как-то сохранить свой бизнес, по мнению агентства, и заставит в скором времени туристические компании брать с клиентов деньги просто за вход в свой офис.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Молдова

Президент назначил парламентские выборы на 22 марта 1998 года

Президент Молдовы Петр Лучинский подписал указ, согласно которому очередные парламентские выборы в Молдове состоятся 22 марта 1998 года.

Выборы назначены в связи с истечением 28 февраля будущего мандата нынешнего парламента, что было подтверждено решением Конституционного суда 10 ноября, и на основе статьи 7(1) Закона о выборах парламента, говорится в указе президента.

Недавно парламент принял в первом чтении Кодекс о выборах, который после утверждения во втором чтении и вступления в силу должен установить обновленную процедуру проведения парламентских выборов.

Литва

Кандидаты в президенты начали агитационную кампанию

В Литве начался завершающий этап президентской предвыборной кампании — кандидаты в президенты развернули агитацию за свои кандидатуры.

Удостоверения получили семеро кандидатов в президенты: выдвинутый центристами, около 50 лет проживавший и работавший в США экс-литовского происхождения 71-летний Валдас Адамкус, представитель оппозиционной Социал-демократической партии, 46-летний член сейма (парламента) Витянис Андрюкайтис, самостоятельно баллотирующийся 74-летний член сейма Казис Бобялис, лидер правящей партии "Союз Отечества", 65-летний председатель сейма Витаутас Ландсбергис, самостоятельно баллотирующиеся 53-летний ректор Вильнюсского университета Роландас Павилёнис, бывший Генеральный прокурор 44-летний Артурас Паулаускас и 36-летний член сейма Римантас Сметона.

С вручения удостоверений кандидаты в президенты получили статус неприкосновенности на период избирательной кампании, право на оплачиваемый двухмесячный отпуск, личную охрану, возможность встречаться с избирателями, за счет средств предвыборной кампании выпустить рекламно-агитационные материалы, в установленном законом порядке пользоваться национальными СМИ для предвыборной агитации.

Кроме того, кандидаты бесплатно получили для демонстрации предвыборных клипов и агитации по политическим вопросам на телевидении и по два часа — на Национальном радио. Агитация за кандидатов на частных телеканалах и радио, в газетах не ограничивается — это будет зависеть только от платежеспособности кандидатов.

Предвыборная агитация прекратится за 30 часов до начала голосования, которое начнется 21 декабря в 7 часов утра и закончится в 21 час (время местное). Предварительные итоги голосования станут известны в ночь с 21 на 22 декабря. Если понадобится второй тур голосования, его намечено назначить на 4 января.

Эстония

Таллинн заинтересован в выходе к месторождениям Северного моря

Эстония заинтересована в расширении своей энергетической системы и выходе через Финляндию к месторождениям Северного моря. "Для энергетики Эстонии это является приоритетным направлением", подчеркнул президент Леннарт Мери на встрече с премьер-министром Финляндии Пааво Липпоненом, который находился в Таллинне с однодневным рабочим визитом.

Как сообщили "Интерфаксу" в пресс-службе президента, П.Липпонен подчеркнул на встрече, что Финляндия выступает за создание единой энергосистемы Балтийского моря.

По инициативе премьер-министра, стороны рассмотрели возможность подписания эстонско-российского пограничного договора. При этом П.Липпонен высказался за его скорейшее заключение, отметив, что "окончательное оформление пограничного договора не помешает Эстонии двигаться в сторону Европейского Союза".

Л.Мери высказал признательность народу, правительству и политикам Финляндии за поддержку в вопросе о вхождении Эстонии в ЕС. "Полное членство в Европейском Союзе является нашим внешнеполитическим приоритетом", — заявил глава государства.


Комментируя инициативу Москвы, предложившей странам Балтии свои гарантии безопасности, финский премьер П.Липпонен подчеркнул неделимость европейской безопасности, которую призваны обеспечивать такие организации, как ОБСЕ и ООН. Вместе с тем, он считает, что сам по себе факт появления подобной инициативы свидетельствует о стремлении Москвы "к стабилизации отношений с государствами балтийского региона".

П.Липпонен позитивно расценил деятельность эстонского правительства, направленную на интеграцию населения республики. Он, в частности, положительно отозвался о решении предоставить постоянным видам на жительство всем негражданам, проживающим в республике не менее пяти лет.

Финляндия, по словам ее премьера, выступает за принятие Эстонии в ЕС в числе первых новых членов. В этой связи он подчеркнул, что "отсутствие договора о границе между Эстонией и РФ не станет препятствием для вступления эстонского государства в Европейский Союз".

По материалам "Интерфакса".

В объективе — Литва



Тракайский замок.

Духоўны скарб

Уладзімір АРЛОЎ

25. Гетман Астрожскі і перамога пад Воршай



КАНСТАНЦІН АСТРОЖСКІ

Новы вораг

Разбіўшы нямецкіх рыцараў пад Грунвальдам, нашы продкі заваявалі мір на сваёй заходняй мяжы. Але хутка ў Вялікага княства Літоўскага з'явіўся небяспечны вораг на ўсходзе. Гэта была Руская дзяржава, якую тады называлі Масковіяй.

Маскоўскія князі аб'ядналі рускія княствы і пачалі прагна паглядаць на суседнюю краіну. Да гэтага Беларусь ніколі не была пад уладаю Масквы.

Масковія распачала з Вялікім княствам бясконцыя крвывавыя войны. Рускія ваяводы часта нападалі на Полацк, Віцебск, Мсціслаў ды іншыя памежныя беларускія паселішчы. Іх абаронцы мужна біліся з ворагамі, частавалі іх з гарадскіх сценаў кіпучай смалою і варам. Калі ўзяць горад не ўдавалася, захопнікі палілі навакольныя вёскі, гналі ў палон тысячы мірных жыхароў.

Рускія землі доўгі час былі ў татарскай няволі. Хоць яны і вызваліліся, парадкі ў Масковіі засталіся такія ж дзікія і жорсткія, як і пры татарах. Усе павінны былі слепа выконваць волю вялікага князя і называць сябе ягонымі халопамі — гэта значыць, рабамі. Маскоўскія князі ваявалі не ўменнем, а колькасцю, чужую зямлю выпальвалі і ўчынялі над яе жыхарамі нялюдскія расправы.

Татарскія набегі

Велізарнай бядою былі ў той час для нашай Бацькаўшчыны і набегі ваяўнічых крымскіх татараў. Амаль штогод іхняя конніца ўрывалася на землі Вялікага княства, рабавала і вяла людзей у рабства. Крымчакі пакідалі за сабою попел пажарышчаў, целы забітых і нязмернае гора жывых.

Але штораз нашы продкі давалі клятву адпомсціць ворагу і выпраўляліся ў пагоню. У 1506 годзе каля горада Клецка беларуска-літоўскія войскі здагналі татарскую арду і ўшчэнт разбілі яе. Чатыры тысячы татараў трапілі ў той дзень у палон, а сорак тысяч палонных жанчын і дзяцей атрымалі свабоду.

Асабліва шмат перамогаў над татарамі здабыў знакаміты беларускі ваявода Канстанцін Астрожскі.

Князь Канстанцін Астрожскі

Род Астрожскіх паходзіў ад князёў, што некалі валадарылі ў старажытным Тураве. Мужчыны з гэтага роду спрадвеку славіліся ваярскім майстэрствам.

Князю Канстанціну ад самай ранняй маладосці давялося ўдзельнічаць у барацьбе з крымскімі татарамі на землях Беларусі і Украіны. Крымчакі вымаўлялі ягонае імя з павагаю і страхам. Аднойчы Астрожскі захапіў у палон нават самога хана Махмет-Гірэя.

Беларускі ваявода ніколі не выходзіў насустрач татарскім атрадам, калі яны пачыналі набег. Ён чакаў, пакуль ворагі будуць вяртацца са здабычаю назад. Выведнікі сачылі за імі і паведамлялі Астрожскаму, дзе арда рабаўнікоў спынілася на адпачынак.

Князь загадваў сваім коннікам загадзя нарыхтаваць харч, каб не распальваць уначы вогнішча. У цемры воіны асцярожна абкружалі татарскі стан. Захопнікі ў гэты час рэзалі бараноў, смажылі мяса, спакойна балявалі і кладліся спаць. А як толькі ўзыходзіла сонца, на сонных татараў віхураю наляталі княжыя воіны.

Канстанцін Астрожскі ваяваў так удала, што вялікі князь прызначыў яго найвышэйшым гетманам — начальнікам над усімі войскамі дзяржавы. Тады ваяводу было толькі 37 гадоў. Ніхто дагэтуль не атрымліваў гэткай важнай пасады ў такім маладым веку.

Тыя, хто верыў у незвычайны ваярскі талент новага гетмана, не памыліліся. Князь Канстанцін адолеў ворага ў 63 бітвах.

Астрожскі не толькі бараніў Айчыну са зброяй у руках. Ён будаваў замкі, манастыры і цэрквы, адчыняў на свае грошы школы і шпіталі для хворых. Пра Астрожскага пісалі, што ён быў узорам таго, як трэба жыць і працаваць, каб быць пераможцам.

Найбольшую ж славу прынесла беларускаму гетману перамога над маскавітамі пад Воршай.

Зноў вайна

Маскоўскі князь Васіль III абвясціў Вялікаму княству новую вайну. Ягоным ваяводам удалося авалодаць старажытным беларускім горадам Смаленскам. Крамлёўскаму ўладару здавалася, што ён без цяжкасцяў зойме ўсю Беларусь. Ён нават загадаў прыгнаць беларускае войска пугамі, як статак жывёлы, да маскоўскае брамы.

Сеючы на нашай зямлі смерць, ворагі захапілі Крычаў, Мсціслаў, Дуброўну і рваліся да Менска. Насустрач непрыяцелю выступіў гетман Астрожскі.

Маскоўскія ваяводы сабралі ўсю сваю збройную сілу на беразе рэчкі Крапіўны недалёка ад Воршы. У іх было 80 тысяч коннікаў. Гетман вёў з сабою толькі 25 тысяч конных і пешых воінаў. Ведаючы гэта, чужынцы не сумняваліся, што здабудуць лёгкую перамогу.

Уначы перад бітваю Астрожскі падышоў да Дняпра і пераправіў свае атрады на другі бок ракі, дзе, расцягнуўшыся на некалькі вёрстаў, яго чакала рускае войска. Частка конніцы перайшла раку ўброд. Для астатніх воінаў беларускія майстры хутка навялі масты са звязаных, добра заканапачаных бочак.

На досвітку 8 верасня 1514 года палкі Астрожскага ўжо стаялі ў баявым парадку насупраць ворага. Зірнуўшы направа, гетман бачыў беларускую конніцу. Злева рыхтаваліся да бою польскія конныя дружыны, а пасярэдзіне са стрэльбамі-рушніцамі напагатове чакала пяхота. Пяхоту прыкрывала частка гарматаў. Астатнія гарматы Астрожскі схаваў у засадзе.

Бітва на рэчцы Крапіўне

Загрымелі баявыя бубны, заспявалі трубы-сурмы з турыных рагоў, і сеча пачалася.

Воіны Канстанціна Астрожскага лёгка адбілі першую атаку маскоўскай конніцы. Гетман лётаў на сваім даўганогім жарабцы наперадзе і аддаваў загады. Пасля абмену атакамі рускія ваяводы паспрабавалі абкружыць войска Вялікага княства, аднак князь Канстанцін адразу разгадаў гэтую задуму.

